## 5 снежня ў краязнаўчым музеі каледжа ў рамках ажыццяўлення праекта “Дарога да дома” прайшло мерапрыемства “Бацькоўская хата”.

**Сям'я - маленькая мадэль вялізнага Сусвету. З яе пачынаецца першы ўздых, першы крок, першае слова. Тут нас чакаюць першыя адкрыцці і расчараванні, першыя знаходкі і страты. У ёй мы спасцігаем першыя каштоўнасці.**

Сучаснае пакаленне моладзі толькі з кніг ведае, што такое патрыярхальная беларуская сям'я, калі ў невялікім доме пад адным дахам пражывалі і перажывалі радасці і гароты некалькі пакаленняў, і кожнае выконвала сваю місію:

бабуля - дзядуля - першае пакаленне, якое выконвала функцыю захавання роду і яго традыцый;

бацька - маці - другое пакаленне, якое выконвала функцыю працягу роду і яго традыцый;

дзеці - унукі - трэцяе пакаленне выконвала функцыю павелічэння роду, захавання традыцый і перадачу гісторыі роду нашчадкам.

Менавіта ў такіх сем'ях панавала атмасфера адзінства і цэласнасці, спакою і ўтульнасці, нябачна і ненадакучліва ішоў працэс выхавання і станаўлення дзіцяці, яго асобы. Дом гэты станавіўся радавым гняздом, у якім старэйшыя перадавалі свой досвед, традыцыі сям'і, звычаі народа малодшым; адкуль птушаняты, пасталеўшы, ляцелі ў свет, у іншыя краі. Але куды б ні закідваў іх лёс, яны выносілі з сабой жыццёвы вопыт продкаў, удзячна перадаючы і сваім нашчадкам іх традыцыі, парады і наказы. Сёння мы б назвалі гэты працэс народнай педагогікай.

**Мы прапанавалі сваім госцікам завітаць у беларускую хатку, дзе не было нічога лішняга і непатрэбнага, але ўсё мела свой сэнс.**



**Хатка пачынаецца з парога**, з якім звязана шмат народных прыкмет, аб якіх і распавялі нам гаспадары.

Чырвоны кут, стол, печ… - усё у хатцы нашых продкаў несла на сабе нейкі ўзнёслы сэнс.

**Чырвоны кут** у хаце беларуса лічыўся вялікім, святым. Ён займаў ў хаце сакральнае месца, якое цесна спалучана з месцам размяшчэння печкі - крыніцы цяпла ў хаце. Але ён заўсёды абавязкова павінны быў знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы хаты.

Менавіта туды ставілі абразы, пакрытыя ручнікамі - набожнікамі, грамнічныя свечкі, святыя кнігі ды святую ваду. Самі ж абразы імкнуліся не вешаць, а ставіць на адмыслова прымацаваныя для гэтай мэты драўляныя паліцы-падстаўкі. Дзе-нідзе іх нават упрыгожвалі разьбою.

Чырвоны кут з'яўляецца сакральным месцам у традыцыйнай беларускай хаце, гэта тое месца, якое звязвае чалавека з Богам і дазваляе яму трымаць з Ім сувязь.

Чырвоны кут беларусы называюць яшчэ: покуць, покут





Няма нічога больш даражэйшага і паважанага ў вясковай хаце, чым **печ**. Яна і корміць, і поіць, і грэе, і гоіць усю сям'ю. У ёй, у вялікіх і маленькіх пузатых чыгунках, вараць жыдкую бульбу ці прасяную кашку са смятанкавай румянай пеначкай, смажаць шматкі сала, пякуць пірагі - усе стравы, што потым падаюцца на стол. Можна смела сказаць, што печ - самая сапраўдная карміцелька вясковай сям'і. Яна - галоўная асоба ў кожнай хаце. І займала ў ёй самае пачэснае месца: у куце, ля парога. Яна першай сустракае гаспадароў з двара ці гасцей з вуліцы







Гарадскі госць, наеўшыся баршча, стомленага ў гэткай печы, ад якога за вушы не адарвеш, вышкрабе лыжкаю посуд, падымецца з-за стала ды пахваліць гаспадыньку за смачны абед, а печы, часам, добрага слова не знойдзе. А гэта ж яна згатавала такія смакотныя стравы! Такіх аніяк не прыгатуеш на пліце ці ў духоўцы гарадской кватэры.



Ужо надыйшоў Піліпаўскі пост, калі нашы продкі пад цьмянае святло "лучыны", а ў пазнейшыя часы - газавай лямпы "газоўкі" прымаліся за хатнія справы: жанчыны садзіліся за ткацкія станкі, калаўроты, бралі ў рукі спіцы, іголкі ды гаплікі. Хтосьці праў кудзелю з ільняных або шарсцяных нітак, хтосьці ткаў з іх палатно, кілімкі і папоны - дзяружкі, вязаў сурвэткі і абрусы, шыў ці вышываў кашулі.



Мужчыны таксама не заставаліся без справы: яны бралі ў рукі капыл або калодку - плялі лапці, шылі чуні з лямца і тканіны, або боты-туфлікі са свіной або цялячай скуры, валялі з воўны валёнкі, плялі вялікія кашы ды маленькія кошыкі, вучылі дзетак стругаць, рабіць розныя вырабы - далучалі да справы.

Удзельнікі мерапрыемства ў якасці запрошаных гасцей (а імі сталі навучэнцы 1 курса) на свае вочы пабачылі ўсё, што пакінулі нам нашы продкі, разгадалі загадкі пра хату і хатнія рэчы.

**Мы прапанавалі удзельнікам мерапрыемства паважаць, шанаваць і любіць бацькоўскую хату. Можа так стацца, што менавіта малюнак бацькоўскай хаты дапаможа многім выжываць у самыя нялёгкія хвіліны жыцця, бо ў ёй захавана ўсё тое, чым жылі нашыя продкі: каханне і запал, гора і боль страт, радасць жыцця і горкая доля ...**



